**У.Ф.Красюк,** *дацэнт*

# МЕТАДЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ КІРАВАННЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТАЙ СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ САЦЫЯЛЬНА-ГУМАНІТАРНЫХ ДЫСЦЫПЛІН

Сучасная сацыякультурная сітуацыя патрабуе ад асобы ўменне ажыццяўляць змястоўны самааналіз сваіх ведаў і светапоглядных перакананняў. Асоба арганічна звязана з навукова-педагагічным асяроддзем, якое садзейнічае фарміраванню яе інтэлектуальнага і духоўнага аблічча. Значная роля ў гэтым працэсе належыць самастойнай рабоце студэнтаў, якую арганізуе і накіроўвае выкладчык.

Сённяшнія тэхналогіі навучання патрабуюць комплекснага падыходу да арганізацыі выкладання сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Роля выкладчыка з'яўляецца значнай і адказнай у кіраванні працэсам вывучэння матэрыялу. Самастойная работа ў гэтым працэсе разглядаецца як цэласны фактар павышэння эфектыўнасці засваення ведаў.

Існуюць два асноўныя падыходы ў ажыццяўленні самастойнай работы студэнтаў і вызначэнні аптымальнага месца выкладчыка ў ёй. Згодна з першым самастойная работа студэнтаў (СРС) разглядаецца як від заняткаў, накшталт семінара, арганізуецца выкладчыкам і ажыццяўляецца пад яго кантролем. У адпаведнасці з другім падыходам веды засвойваюцца студэнтам у выніку актыўнай мэтанакіраванай самастойнай пазнавальнай дзейнасці, без непасрэднага ўдзелу выкладчыка, але з ажыццяўленнем ім кантролю. З улікам магчымасцей атрымоўваць неабходную інфармацыю пры дапамозе камп'ютэрнай тэхнікі і іншых сродкаў далучэння да навуковых ведаў, будучыню вызначае другі падыход.

Вызначальныя ўмовы эфектыўнасці СРС наступныя:

– забеспячэнне неабходнага спалучэння аб'ёму аўдыторнай і пазааўдыторнай працы;

– метадычнае забеспячэнне правільнай арганізацыі работы студэнта;

– забеспячэнне студэнта неабходнымі вучэбнымі і метадычнымі матэрыяламі з мэтай пераўтварэння працэсу самастойнай працы ў працэс творчы;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– кантроль за ходам СРС і яе ацэнка выкладчыкам [1].

Паводле ступені праяўлення творчага патэнцыялу студэнтаў выдзяляюцца наступныя віды самастойнай работы:

– узнаўляльная (работа па ўзоры);

– рэканструктыўна-варыятыўная (знаёмы спосаб пераносіцца ў незнаёмую сітуацыю);

– эўрыстычная (перанос некалькіх знаёмых спосабаў у нестандартную сітуацыю);

– творчая, даследчая (стварэнне новага спосабу) [2].

Для рэалізацыі ідэі актыўнага навучання, якая інтэгруе самастойную падрыхтоўку студэнтаў і іх творчую працу, напрыклад на семінары, можна выкарыстаць эўрыстычны метад, сутнасць якога заключаецца ў арганізацыі працэсу прадуктыўнага нестандартнага мыслення, пастаноўцы і вырашэнні задач, звязаных з мадэлямі прыняцця дакладных установак ва ўмовах праблемных сітуацый. Эўрыстычнае навучанне – гэта калектыўны метад вырашэння цяжкіх праблем, ён заснаваны на тым, што члены акадэмічнай групы актыўна ўдзельнічаюць у абмеркаванні адказу свайго таварыша, задаюць яму дадатковыя пытанні, патрабуюць аргументацыі адказу, прыводзяць контраргументы. Эўрыстычны метад абавязвае выкладчыка задаваць студэнтам серыю пытанняў, прыводзіць прыклады. Гэты метад садзейнічае стварэнню праблемных сітуацый, атмасферы пошуку і навацый.

Метадычныя асаблівасці мае кіраванне СРС у залежнасці ад мэт і задач, якія павінны быць вырашаны. Тут выдзяляюцца наступныя віды самастойнай работы:

– па ўдакладненні і дапаўненні ведаў, атрыманых на семінарах і лекцыях;

– па фарміраванні навыкаў на аснове выканання заданняў;

– па набыцці студэнтамі новых ведаў;

– па развіцці ў студэнтаў агульнавучэбных уменняў, уменняў канкрэтнага і абстрактнага мыслення;

– па задавальненні адукацыйных інтарэсаў навучэнцаў [3].

Што датычыць этапаў самастойнай работы студэнтаў, то яны могуць быць наступныя: падбор літаратуры, сайтаў, аўдыё-, відэаматэрыялаў; вывучэнне і аналіз матэрыялу падручнікаў і дадатковай літаратуры; вывучэнне і канспектаванне неабходных першакрыніц; ажыццяўленне не толькі выкладчыкам кантролю, але

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і студэнтамі самакантролю ведаў; складанне пытанняў, што выклікалі цяжкасці, тлумачэнне іх на кансультацыі.

Дакладная метадалагічная арганізацыя СРС садзейнічае якаснаму засваенню матэрыялу, паляпшае агульнае кіраванне вучэбным працэсам, стымулюе сістэму кантролю за ўзроўнем атрыманых ведаў.

У працэсе навучання студэнтаў у іх развіваюцца здольнасці і фарміруюцца навыкі творчага засваення ведаў, выхоўваецца імкненне да атрымання новых ідэй. Характэрнымі рысамі творчага мыслення з'яўляюцца перш за ўсё яго дыялектычнасць, аптымальнае спалучэнне рэпрадуктыўных і прадуктыўных ведаў. Вывучэнне філасофіі, культуралогіі, сацыялогіі, паліталогіі, права і іншых дысцыплін садзейнічае як набыццю ведаў, так і актуалізуе здольнасці студэнтаў да крытычнага мыслення, пераадолення рознага роду штампаў і ўстарэлых па змесце ўяўленняў у разуменні праблем асабістага і грамадскага жыцця.

Формамі СРС могуць быць падрыхтоўка да лекцый і семінарскіх заняткаў; вывучэнне і канспектаванне першакрыніц; напісанне дакладаў і рэфератаў; самастойнае вывучэнне тэмы ў складзе праблемнай групы; выкананне даследчых і творчых заданняў; удзел студэнтаў у складанні тэкстаў; напісанне курсавых і навуковых работ; складанне бібліяграфіі па пэўнай тэме і інш. "У якасці форм кантролю СРС выкарыстоўваюцца выніковыя семестравыя залікі і экзамены; правядзенне выкладчыкам індывідуальных гутарак і кансультацый; праверка рэфератаў і пісьмовых дакладаў; тэсціраванне; правядзенне групавых пісьмовых кантрольных работ з іх праверкай і інш." [4, с. 121–122]. Пры гэтым трэба ўлічваць, што, напрыклад, "работа па падрыхтоўцы дакладаў і рэфератаў складаная, шматпрофільная і працаёмкая, а паколькі час студэнта і выкладчыка абмежаваны, то тут крыецца небяспека фармалізму. Каб гэтага не адбылося, неабходна зацікавіць студэнтаў гэтай формай вучэбнай работы, умела яе арганізаваць" [5, с. 55].

Роля выкладчыка ў арганізацыі СРС вызначаецца тым, што ён – галоўная асоба ў вучэбным працэсе. Менавіта выкладчык вызначае разнастайнасць форм падрыхтоўкі і кіравання ходам дадзенай працы: дае папярэднія ўстаноўкі, арганізуе калектыўныя і індывідуальныя кансультацыі, гутаркі; калёквіумы і інш. Задача выкладчыка – падрыхтаваць і сфармуляваць тэмы і пытанні,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арыентаваныя на вывучэнне матэрыялу; яны неабходны для актывізацыі мыслення студэнтаў, іх пошукавай дзейнасці.

---

1. *Сергеенкова, В.В.* Управляемая самостоятельная работа студентов. Модульно-рейтинговая и рейтинговая системы / В.В.Сергеенкова. – Мн., 2005.

2. *Пидкасистый, П.И.* Искусство преподавания. Первая книга учителя / П.И.Пидкасистый, М.Л.Портнов. – М., 1998.

3. *Педагогические* основы самостоятельной работы студентов: пособие для преподавателей и студентов / под ред. О.Л.Жук. – Мн., 2005.

4. *Подольная, Л.Л.* Управляемая самостоятельная работа студентов в педагогическом вузе / Л.Л.Подольная // Педагогическое образование в условиях трансформационных процессов: методология, теория, практика: материалы III Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 7–8 декабря 2006 г. БГПУ им. М.Танка. – Мн., 2007.

5. *Степанов, Г.И.* Использование докладов и рефератов на семинарских занятиях по политологии / Г.И.Степанов // Обществоведение в системе современного высшего образования: новые концепции, подходы в теории, методологии и методике преподавания: тезисы докладов респ. науч. конф., 23 апреля 1999 г., БГПУ им. М.Танка. – Мн., 1999.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ